**Swiatłana Czuwak**
*Grodzieński Uniwersytet Państwowy im. Janki Kupały*
ORCID: 0000-0001-7939-4118

# ЭЛІЗА АЖЭШКА І ЛІТАРАТУРНЫ ТУРЫЗМ: ФОРМЫ РАЗВІЦЦЯ

Літаратурны турызм з'яўляецца адной з формаў тэматычнага турызму, які апошнім часам становіцца ўсё больш актуальным, што звязана найперш з актыўнай дыверсіфікацыяй турыстычных прадуктаў і паслуг. Актыўная дыверсіфікацыя звязана з глабальнай трансфармацыяй міжнароднага турыстычнага рынку, якая выклікана наступствамі пандэміі COVID-19. Павелічэнне ролі і аб'ёмаў рынку ўнутранага турызму патрабуе пошуку новых форм, тэхналогій і зместу абслугоўвання турыстаў і экскурсантаў. Сучасныя вандроўнікі праяўляюць усё больш зацікаўленнасці ў знаёмстве са ўсімі аспектамі турыстычнай дэстынацыі. Іх цікавяць гісторыя, культура, магчымасць інтэрпрэтацыі разнастайных праяваў матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны рэгіёна ў адпаведнасці з інтарэсамі і культурным багажом спажыўцоў. Тэматычны турызм дае магчымасці для развіцця турыстычнай прапановы ў такім напрамку.

У міжнароднай тэорыі турызму пакуль няма аднаго, усімі прызнанага азначэння паняцця тэматычны турызм. У спецыялізаваных даследаваннях ён можа называцца *special interest tourism* (турызм асаблівых зацікаўленняў), а таксама *thematic tourism* (тэматычны турызм)[1] [1, 2, 3] акрэсліваецца як від турызму, галоўнай мэтай якога з'яўляецца наведванне месцаў, звязаных вузкаспецыялізаванай тэматыкай. Асноўнай матывацыяй такога віду турызму можна лічыць адпачынак, магчымасць займацца любімай справай у асяроддзі аднадумцаў (хоббі-вандроўкі па інтарэсах). Спажыўцамі такога віду турызму з'яўляецца шырокае кола людзей: ад дзяцей да людзей сталага ўзросту ў

[1] Promotion of trans-national thematic tourism products in the European Union as means of sustainable tourism development. Grant programme 2011 [Electronic resource] – Mode of access: https://ec.europa.eu/ – Date of access: 18.10.2021; Vana, M., Malaescu, S. Cultural Thematic Tourism Itineraries: Mediators of Success/ M. Vana, S. Malaescu [Electronic resource]: Procedia Economics and Finance, Volume 39, 2016 – Mode of access: https://doi.org/10.1016/S2212-5671(16)30311-2. – Date of access: 18.10.2021; Thematic Areas: Multi-destination alliances: resources and shared offer [Electronic resource]: Aldeias Historicas de Portugal. – Mode of access: https://www.responsibletourisminstitute.com/en/event/aldeias/topics. – Date of access: 18.09.2021.

залежнасці ад напрамку і тэматыкі тура. Асаблівасцю тэматычнага турызму з'яўляецца тое, што ўспрыманне турыста або экскурсанта акцэнтуецца на асаблівых, адметных характарыстыках дэстынацыі ў межах знаёмства з адным з аспектаў яе культуры і гісторыі.

Мы думаем, што знаёмства з культурнай спецыфікай рэгіёну праз літаратурны турызм дазваляе турысту або экскурсанту ў больш даступнай, палегчанай форме інтэрпрэтаваць культурныя асаблівасці незнаёмага рэгіёну. Напрыклад, чытанне мастацкіх тэкстаў дазволяе не толькі ўзбагаціць уяўленні пра апісаныя месцы, звязаныя з сюжэтам твора, але і становіцца трывалай базай да ўспрымання краіны, рэгіёну праз прызму яе традыцый і каштоўнасцей.

З'яўленне літаратурнага турызму ў структуры сучаснай турыстычнай індустрыі не выпадковае, яно выклікана найперш узаемным пранікненнем літаратуры і турызму. Так, турыст, вандроўнік – гэта найперш асоба, якая імкнецца да атрымання новых ведаў, якія без пісьмовай фіксацыі былі ці страчаныя, ці забытыя. Дзякуючы рукапісным і друкаваным творам рознай жанравай накіраванасці праз стагоддзі мы можам атрымаць звесткі пра гісторыю, культуру розных краін. Нататкі, мемуары вандроўнікаў розных часоў і краін можна смела лічыць прататыпамі сучасных турыстычных даведнікаў. У 2021 годзе адзначалася 420 год сусветнавядомай "Перэгрынацыі або Паломніцтва ў Святую зямлю" Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі. Кніга была выдадзена ў 1601 годзе і была першым навукова-папулярным геаграфічным выданнем, адзіным да XIX стагоддзя даведнікам для жыхароў Рэчы Паспалітай пра Усход[2]. "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" Уладзіслава Сырокомлі аказаліся не толькі нарысамі пра гарады і мястэчкі Беларусі, але і часткай літаратурнай спадчыны паэта[3]. Літаратурная спадчына паэтаў і пісьменнікаў Беларусі ў XX стагоддзі стала не проста культурным скарбам беларускай культуры, але і шматгранным і вельмі ёмістым рэсурсам для развіцця айчыннай турыстычнай індустрыі. Напрыклад, вобраз замку Сапегаў у рамане Уладзіміра Караткевіча "Чорны замак Альшанскі", які ў многім быў сфармаваны творчым уяўленнем аўтара, па сутнасці сфармаваў турыстычны вобраз не толькі помніка архітэктуры ў Гальшанах, але і паспрыяў фармаванню турыстычнага брэнда мястэчка.

2 420 лет читаем «Перегринацию» Радзивилла Сиротки [Электронны рэсурс] // Сайт Национальной библиотеки Республики Беларусь. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/420-let-chitaem-peregrinatsiyu-radzivilla-sirotki// – Дата доступу: 24.09.2021.

3 Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследванні гісторыі і звычаяў / пер з польск., прадм, камент. К.Цвіркі. – Мн: Полымя, 2002. – 205с.

У такой сітуацыі літаратурны турызм выступае як від тэматычнага турызму, які звязаны з месцамі і падзеямі, што апісваюцца ў літаратурных творах, а таксама жыццём аўтараў гэтых твораў. Асноўнымі прынцыпамі літаратурнага турызму з'яўляецца знаёмства з памятнымі мясцінамі, звязанымі з жыццём і творчасцю пісьменнікаў, падарожжы за героямі літаратурных твораў па месцах, дзе развіваліся падзеі, апісаныя ў іх творах; наведванне літаратурных музеяў, мемарыялаў і іншых аб'ектаў, якія выклікаюць цікавасць усіх, хто ведае і цікавіцца талентам пісьменніка.

Літаратурны (тэматычны) турызм дазваляе па-новаму ўбачыць як папулярныя, так і малавядомыя аб'екты паказу за кошт выяўлення і ўзмацнення спецыфікі прадстаўляемых аб'ектаў. Літаратура (мастацкая, дакументальная і г.д.) дае магчымасць "падрыхтаваць" турыста да ўспрымання новай інфармацыі ў большай ступені. Літаратурны турызм станоўча ўплывае на культурнае развіццё рэгіёну: захоўваецца гісторыка-культурная спадчына, ствараюцца і захоўваюцца помнікі, архітэктурныя ансамблі, тэатры і г.д.

Літаратурны турызм выступае актыўным сродкам для стымуляцыі паўторных візітаў. Важнай асаблівасцю дадзенага віду турызму з'яўляецца тое, што ён стварае варыятыўнасць, разнастайнасць турыстычнай прапановы, пашырае арэал турыстычных наведванняў, уводзіць у актыўнае карыстанне турыстычныя рэсурсы так званага другога ці трэцяга плана. Такія рэсурсы, якія не валодаюць самабытнай, выключнай атрактыўнасцю і набываюць сваю актуалізацыю ў спалучэнні з іншымі рэсурсамі пры пэўнай тэматычнай падачы.

Сёння літаратурны турызм у сваім развіцці дасягнуў значных маштабаў, сфармавалася мноства разнастайных форм, відаў такога напрамку тэматычнага турызму. Мы іх разгледзім на прыкладзе літаратурнай спадчыны Элізы Ажэшкі.

Вылучаюць наступныя формы літаратурнага турызму:

1. Экскурсійная форма рэалізуецца ў форме аднадзённага падарожжа і прадугледжвае знаёмства з творчым і жыццёвым шляхам пісьменніка праз агляд адпаведных лакацый, якія адпавядаюць тэме экскурсіі. Такая форма літаратурнага турызму з'яўляецца адной з самых папулярных.

Экскурсійная форма можа быць прадстаўлена ў наступных відах:

– Літаратурна-біяграфічныя экскурсіі, маршрут якіх пабудаваны ў цеснай сувязі з біяграфіяй пісьменніка. Такія экскурсіі найбольш традыцыйна паказваюць літаратурнае развіццё аўтара ў канве яго жыццёвых калізій. Менавіта цікавасць да творчасці Элізы Ажэшкі ў кантэксце яе грамадскай, культурнай дзейнасці стварае ўмовы для стабільнай папулярнасці літаратурна-

біяграфічных экскурсій па мясцінах Элізы Ажэшкі. Шматлікія турысты, экскурсанты наведваюць Мількаўшчыну, месца колішняй сядзібы, дзе нарадзілася пісьменніца, сямейныя могілкі, дом-музей пісьменніцы ў Гродна.

– Гісторыка-літаратурныя экскурсіі праводзяцца там, дзе можна паказаць і расказаць пра пэўныя перыяды развіцця літаратуры. Такія экскурсіі патрабуюць большай падрыхтаванасці турыстычнай аўдыторыі. Творчасць Элізы Ажэшкі разглядаецца ў кантэксце літаратурных сувязяў не толькі канца XIX – пачатку XX стагоддзя – творчыя і асабістыя сувязі з Францішкам Багушэвічам, Цёткай (Алаізай Пашкевіч), але і ўплыў Э. Ажэшкі на развіццё літаратуры як рэгіянальнай, так і нацыянальнай у XX стагоддзі.

– Літаратурна-мастацкія экскурсіі ахопліваюць месцы, якія знайшлі адлюстраванне ў творах літаратуры. Такі від экскурсій, звязаных з літаратурнай спадчынай Ажэшкі, таксама надзвычай папулярны і традыцыйны. Ядром такіх экскурсій, часцей усяго, выступае раман "Над Нёманам". Багатырэвічы, лёс не толькі герояў твора, але і памяць пра падзеі 1863 года і многія іншыя сюжэтныя лініі літаратурнага шэдэўра пісьменніцы штогод адпраўляюць сотні вандроўнікаў на веласіпедах, аўтобусах, пешшу рухацца насустрач да месцаў геніяльнага твора. У такім выпадку твор выступае самадастатковай, незалежнай тэмай экскурсіі. Творчасць Элізы Ажэшкі такая разнастайная і шматбаковая, што героі і персанажы яе твораў могуць выступаць як вельмі трапныя падтэмы ў экскурсіях. Напрыклад, адно з месцаў экскурсіі "Па Валкавыску і Валкавыскаму краю" – колішняе мястэчка, а зараз аграгарадок – Волпа. Адэкватна паказаць тэму яўрэйскай Волпы немагчыма без героя навелы Элізы Ажэшкі "Гедалі". Цікава, што папулярным няшчасны і сціплы філосаф Гедалі становіцца яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Гедаль, прататып галоўнага героя навелы, пешшу прыйшоў да пісьменніцы ў Гродна, каб ёй аддзячыць: «Перед этим никто на Гедаля не хотел смотреть, а как госпожа меня описала, то сейчас приезжают пассажирскими каретами и рисуют с меня портреты. А когда я на такой карете ехал через Волпу, то все жители смотрели и удивлялись, что это с Гедалем делается»[4].

2. Анімацыйная форма рэалізуецца ў форме наведвання тэатралізаванага прадстаўлення, у аснове якога ляжыць літаратурны твор, наведванні літаратурнага тэматычнага парка, удзел у літаратурным фестывалі, святе. Такія формы літаратурнага турызму вельмі прыцягальныя сваёй інтэрактыўнасцю. Экскурсанты, турысты непасрэдна ўдзельнічаюць у святах, прадстаўленнях у розных формах. Самай папулярнай формай

[4] Либерман, Я.Л. Бабелевский Гедали и его прототипы / Я.Л.Либерман [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elar.urfu.ru/bitstream/10995/49791/1/dc-1996-019.pdf. – Дата доступу: 20.08.2021.

такога віду экскурсій, звязанай з творчасцю Э. Ажэшкі, з'яўляецца летні бал, які штогод адбываўся да 2020 года. Бал праводзіўся па арыгінальнай праграме 1907 года і быў максімальна набліжаны да рэалій пачатку XX стагоддзя. Танцавальная праграма ўключала полькі, вальсы, паланэзы, кадрылі. Выконваліся танцы як падрыхтаванымі танцавальнымі парамі, так і аматарамі, былі арганізаваны майстар-класы для ўсіх ахвотных[5]. На бале працавала кветкавая пошта: кожны мог у адпаведнасці з мовай кветак скласці сваю фларыстычную кампазіцыю і даслаць адрасату на бале. Яшчэ адной вельмі папулярнай інтэрактыўнай пляцоўкай з'яўляецца модны салон прычосак пачатку XX стагоддзя. З дапамогай майстра можна ўкласці валасы абавязкова з жывымі кветкамі ў рэтрапрычосцы і зрабіць фота ў інтэр'ерах дома-музея. Неад'емнай часткай бала заўсёды з'яўляецца частаванне гарбатай пані Элізы. Афіцыянткі, апранутыя па модзе часоў пісьменніцы, падавалі не толькі травяны чай па рэцэптах Ажэшкі, але і салодкія пачастункі[6].

3. Адукацыйная форма прадугледжвае навучальныя трэнінгі, вывучэнне айчыннай і сусветнай культуры, наведванне бібліятэк і кніжных крамаў. Такая форма літаратурнага турызму найчасцей выкарыстоўваецца для школьных і студэнцкіх груп. У Гродна такая форма літаратурнага турызму паводле жыцця і творчасці Элізы Ажэшкі самая натуральная. Па рашэнні Гродзенскага аблвыканкама 18 чэрвеня 2001 года ў "Доміку Элізы Ажэшкі", дзе зараз знаходзіцца інфармацыйна-адукацыйны цэнтр ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага", адкрыты мемарыяльны пакой, прысвечаны жыццю і творчасці пісьменніцы. Такім чынам, дом пісьменніцы – гэта бібліятэка і музей адначасова. Наведвальнікі маюць магчымасць не толькі ўбачыць мармуровы камін, драўляны тамбур, упрыгожаны разьбой, і балконную агароджу часоў пісьменніцы. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць прыжыццёвыя творы Э. Ажэшкі, перапіска з украінскім пісьменнікам І. Франко, калекцыя старадаўняй мастацкай і гістарычнай літаратуры XIX-XX стагоддзяў, якая ўключае выданні Б. Пруса, Г. Сянкевіча, Ю. Славацкага, Ч. Дзікенса, А. Дзюма, Ж. Эліота.

---

5 Дамы с веерами, галантные кавалеры и полонез в центре города: в Гродно прошел летний бал у Элизы Ожешко [Электронны рэсурс] // Сайт газеты "Гродзенская праўда". – Рэжым доступу: https://grodnonews.by/news/kultura/damy_s_veerami_galantnye_kavalery_i_polonez_v_tsentre_goroda_v_grodno_proshel_letniy_bal_u_elizy_ozh.html. – Дата доступу: 24.09.2021.

6 Как 120 лет назад: Летний бал с участием Элизы Ожешко прошел в Гродно [Электронны рэсурс] // SPUTNIK. Беларусь. – Рэжым доступу: https://sputnik.by/20170617/kak-120-let-nazad-letnij-bal-s-uchastiem-ehlizy-ozheshko-proshel-v-grodno-1029348010. – Дата доступу: 14.11.2021.

Сёння супрацоўнікамі бібліятэкі для наведвальнікаў мемарыяльнага пакоя Элізы Ажэшкі распрацавана некалькі разнапланаваных экскурсій, адапатаваных да розных узроставых катэгорый (на беларускай, рускай, польскай, англійскай і нямецкай мовах):

– Гісторыя жыцця і творчасці Элізы Ажэшкі.
– Дзяцінства Элізы Ажэшкі.
– Каханне ў жыцці Элізы Ажэшкі.
– Дабрачынная дзейнасць Элізы Ажэшкі.
– Эліза Ажэшка і Гродна.
– Сямейныя карані і традыцыі Элізы Ажэшкі[7].

Літаратурна-краязнаўчы музей у в. Мількаўшчына прапануе не толькі традыцыйныя экскурсіі, але і тэматычныя заняткі з элементамі анімацыі: творчая майстэрня "Зельнік пані Элізы", інсцэніроўкі ўрыўкаў з твораў Э. Ажэшкі і г.д.[8].

З пералічаных формаў літаратурнага турызму відаць, што творчасць Элізы Ажэшкі ў турыстычнай практыцы прадстаўлена шырока, у форме аднадзённых экскурсій і тураў, як самастойны турыстычны прадукт, так і важны і неад'емны элемент тэматычных тураў і экскурсій.

Сучасная тэматычная індустрыя, выкарыстоўваючы імя Элізы Ажэшкі, звяртаецца да розных відаў турыстычных рэсурсаў.

Можна вылучыць групу так званых прыродных літаратурных рэсурсаў. Цікавай часткай вандровак па мясцінах пісьменніцы сталі не толькі ваколіцы Гродна і Гродзенскі раён, але і Нёман як магістральны вобраз. Даўно сталі сувенірамі жалуды, сабраныя з дуба, пасаджанага Ажэшкай у сядзібе Бохвіцаў Фларыянава яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Ды і сам дуб стаў гісторыка-культурнай каштоўнасцю менавіта таму, што быў пасаджаны пісьменніцай[9]. Надзвычай запатрабаваным брэндам Ажэшкавай спадчыны сталі зёлкі, травяныя чаі і фларыстыка.

Да антрапагенных літаратурных рэсурсаў найперш варта аднесці літаратурныя музеі: мемарыяльны пакой пісьменніцы ў Гродна, літаратурна-

7 Тэмы экскурсій [Электронны рэсурс] // Сайт ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага». – Рэжым доступу: http://grodnolib.by/%D1%82%D1%8D%D0%BC%D1%8B-%D1%8D%D0%BA%D1%81%D0%BA%D1%83%D1%80%D1%81%D1%96%D0%B9/. – Дата доступу: 24.01.2022.

8 Литературно-краеведческий музей д.Мильковщина [Электронны рэсурс] // Сайт ГУО „Гродненский районный центр творчества детей и молодежи". – Рэжым доступу: https://cvr-grodno.schools.by/pages/milk. – Дата доступу: 14.01.2022.

9 Дуб Ожешко и усадьба Бохвицей [Электронны рэсурс] // Сайт Белорусской лесной газеты. – Рэжым доступу: http://lesgazeta.by/people/vstrecha/dub-ozheshko-i-usadba-bohvicej. – Дата доступу: 14.01.2022.

краязнаўчы музей у Мількаўшчыне. Літаратурная прастора Э. Ажэшкі інтэгравана з музеем-сядзібай Ф.Багушэвіча ў Кушлянах, мемарыяльным пакоем З.Налкоўскай у Гродна, музеем Алаізы Пашкевіч (Цёткі) у Астрыне. Помнікі і бюсты таксама вартасна дапаўняюць турыстычыны вобраз пісьменніцы. Найперш бюст Э. Ажэшкі работы Рамуальда Зэрыха на перакрыжаванні сучасных вуліц Ажэшкі і Тэлеграфнай. Помнік не толькі лічыцца адным з самых старых у горадзе, але і самастойнай культурнай каштоўнасцю XX стагоддзя. Наведванне турыстамі аднаго з самых старых некропаляў Беларусі – старых гродзенскіх могілкаў на Антонава – не абыходзіцца без наведвання магілы пісьменніцы.

На жаль, мы пакуль не маем музея кніг Элізы Ажэшкі або музея яе літаратурных персанажаў. А што датычыць аб'ектаў паказу, звязаных з творамі пісьменніцы, то найперш гэта Гродна. Горад, з якім не толькі звязаны важныя старонкі жыцця Э. Ажэшкі, але і турыстычны вобраз якога немагчыма развіваць без пісьменніцы, яе літаратурнай спадчыны. Вакол месцаў, звязаных з яе жыццём і творчасцю, сфармаваўся запатрабаваны і шматпланавы турыстычны прадукт, які патрабуе развіцця і тэматычнага, і тэхналагічнага, у адпаведнасці з запатрабаваннямі сучаснага турыста.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


- Promotion of trans-national thematic tourism products in the European Union as means of sustainable tourism development. Grant programme 2011 [Electronic resource] – Mode of access: https://ec.europa.eu/ - Date of access: 18.10.2021.
- Vana, M., Malaescu, S. Cultural Thematic Tourism Itineraries: Mediators of Success/ M.Vana, S. Malaescu [Electronic resource]: Procedia Economics and Finance, Volume 39, 2016 – Mode of access: https://doi.org/10.1016/S2212-5671(16)30311-2. – Date of access: 18.10.2021.
- Thematic Areas: Multi-destination alliances: resources and shared offer [Electronic resource]: Aldeias Historicas de Portugal. – Mode of access: https://www.responsibletourisminstitute.com/en/event/aldeias/topics. – Date of access: 18.09.2021.
- 420 лет читаем «Перегринацию» Радзивилла Сиротки [Электронны рэсурс] // Сайт Национальной библиотеки Республики Беларусь. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/420-let-chitaem-peregrinatsiyu-radzivilla-sirotki// – Дата доступу: 24.09.2021.
- Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследванні гісторыі і звычаяў / пер з польск., прадм, камент. К.Цвіркі. – Мн: Полымя, 2002. – 205с.
- Либерман, Я.Л. Бабелевский Гедали и его прототипы / Я.Л. Либерман [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elar.urfu.ru/bitstream/10995/49791/1/dc-1996-019.pdf. – Дата доступу: 20.08.2021.

– Дамы с веерами, галантные кавалеры и полонез в центре города: в Гродно прошел летний бал у Элизы Ожешко [Электронны рэсурс] // Сайт газеты "Гродзенская праўда". – Рэжым доступу: https://grodnonews.by/news/kultura/damy_s_veerami_galantnye_kavalery_i_polonez_v_tsentre_goroda_v_grodno_proshel_letniy_bal_u_elizy_ozh.html. - Дата доступу: 24.09.2021.
– Как 120 лет назад: Летний бал с участием Элизы Ожешко прошел в Гродно [Электронны рэсурс] // SPUTNIK. Беларусь. - Рэжым доступу: https://sputnik.by/20170617/kak-120-let-nazad-letnij-bal-s-uchastiem-ehlizy-ozheshko-proshel-v-grodno-1029348010. – Дата доступу: 14.11.2021.
– Тэмы экскурсій [Электронны рэсурс] // Сайт ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага». – Рэжым доступу: http://grodnolib.by. – Дата доступу: 24.01.2022.
– Литературно-краеведческий музей д.Мильковщина [Электронны рэсурс] // Сайт ГУО «Гродненский районный центр творчества детей и молодежи». – Рэжым доступу: https://cvr-grodno.schools.by/pages/milk. – Дата доступу: 14.01.2022.
– Дуб Ожешко и усадьба Бохвицей [Электронны рэсурс] // Сайт Белорусской лесной газеты. – Рэжым доступу: http://lesgazeta.by/people/vstrecha/dub-ozheshko-i-usadba-bohvicej. – Дата доступу: 14.01.2022.


**Swiatłana Czuwak**
*Yanka Kupala State University of Grodno, Belarus*

## ELIZA ORZESZKOWA AND LITERARY TOURISM: FORMS OF DEVELOPMENT

### Summary

The article is devoted to the analysis of Eliza Orzeszko's literary heritage as a resource for the development of literary tourism. The essence of the concept of literary tourism is defined. The main forms and directions of using E. Ozheshko's heritage in modern tourist practice are shown. The range of main forms of tourist resources related to the life and work of the writer is outlined.

**Key words:** Literary tourism, thematic tourism, animation, excursions, tourist resources, E. Ozheshko's heritage.

**SWIATŁANA CZUWAK** – starszy wykładowca Katedry Turystyki i Dziedzictwa Kulturowego Grodzieńskiego Państwowego Uniwersytetu im. Janki Kupały, kulturoznawca, organizatorka wycieczek krajoznawczych. Zainteresowania naukowe: rola literatury pięknej w kształtowaniu świadomości obywatelskiej na początku XIX wieku.